Андрэй Аляксандравіч Уцюрын

З Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

Андрэй Аляксандравіч Уцюрын (руск.: *Андрей Александрович Втюрин*; 28 ліпеня 1971, Пенза, Пензенская вобласць, РСФСР, СССР) — ваенны дзеяч Рэспублікі Беларусь.

Біяграфія

Нарадзіўся 28 ліпеня 1971 года ў Пензе. Бацька — ваенны, у савецкі час быў камандзірам вайсковай часці 3214 у Мінску[1].

У 1992 годзе скончыў Саратаўскае вышэйшае ваеннае камандное вучылішча МУС Расіі, у 2002 годзе — Акадэмію МУС Беларусі.

З 1995 года працаваў у Службе бяспекі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Шэф-рэдактар «Нашай Нівы» Андрэй Дынько ўспамінаў, што ў сакавіку 2006 года, калі яго арыштавалі пасля прэзідэнцкіх выбараў, у камеру да арыштантаў заходзіў Уцюрын:

> *Уцюрын, не зняўшы норкавай шапкі, пытаўся нас, хто мы, а мы, васьмёра нас было ў камеры, стаялі перад імі і адказвалі. І, калі хто адказваў яму па-беларуску, нянавісць закіпала ў ім і аж вусны яму крывіла…*[2]

Кіраўнік Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з 17 ліпеня 2007 года[1] па 11 верасня 2014 года[3]. 11 верасня 2014 года прызначаны намеснікам Дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі[3][4].

Санкцыі ЕС

Пасля прэзідэнцкіх выбараў 2010 года, 2 лютага 2011 года быў унесены ў Чорны спіс Еўрасаюза[5]. Згодна з рашэннем Савета Еўрапейскага саюза ад 15 кастрычніка 2012 года Уцюрын як начальнік атрада бяспекі прэзідэнта быў прызнаны адказным за камандаванне супрацоўнікамі яго службы, якія ўдзельнічалі ў допытах палітычных актывістаў пасля Плошчы 2010[6].

Крымінальная справа

Пад канец красавіка 2019 года з'явілася інфармацыя, што КДБ Беларусі затрымаў Уцюрына[7], а яго катэдж у Драздах-2 апячатаны[8]. 30 красавіка стала вядома, што ўказам ад 24 красавіка Лукашэнка звольніў Уцюрына з пасады намесніка дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі *«за ўчыненне праступкаў, якія дыскрэдытуюць званне ваеннаслужачага»*[9][10]. 4 мая следчае ўпраўленне КДБ паведаміла, што Уцюрын быў затрыманы разам з доказамі злачынства пры атрыманні 148600 долараў ЗША ад прадстаўніка расійскай камерцыйнай структуры за садзейнічанне ў прасоўванні яе інтарэсаў у Беларусі[11][12].

Андрэй Аляксандравіч Уцюрын

Дата нараджэння	28 ліпеня 1971 (52 гады)
Месца нараджэння	Пенза, Пензенская вобласць, РСФСР, СССР
Альма-матар	Саратаўскае вышэйшае ваеннае камандна-інжынернае вучылішча (https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=%D0%A1%D0%B0%D1%80%D0%B0%D1%82%D0%B0%D1%9E%D1%81%D0%BA%D0%B0%D0%B5+%D0%B2%D1%8B%D1%88%D1%8D%D0%B9%D1%88%D0%B0%D0%B5+%D0%B2%D0%B0%D0%B5%D0%BD%D0%BD%D0%B0%D0%B5+%D0%BA%D0%B0%D0%BC%D0%B0%D0%BD%D0%B4%D0%BD%D0%B0-%D1%96%D0%BD%D0%B6%D1%8B%D0%BD%D0%B5%D1%80%D0%BD%D0%B0%D0%B5+%D0%B2%D1%83%D1%87%D1%8B%D0%BB%D1%96%D1%88%D1%87%D0%B0&action=edit&editintro=Шаблон:Няма_артыкула/editintro&preload=Шаблон:Няма_артыкула/preload&preloadparams%5B%5D=Q4408483&preloadparams%5B%5D=%D0%A1%D0%B0%D1%80%D0%B0%D1%82%D0%B0%D1%9E%D1%81%D0%BA%D0%B0%D0%B5+%D0%B2%D1%8B%D1%88%D1%8D%D0%B9%D1%88%D0%B0%D0%B5+%D0%B2%D0%B0%D0%B5%D0%BD%D0%BD%D0%B0%D0%B5

11 мая 2019 года Лукашэнка паведаміў, што Уцюрын трапіў у поле зроку праваахоўнікаў яшчэ да пераводу ў Савет бяспекі і ўжо на працягу амаль двух гадоў знаходзіўся пад кантролем спецслужбаў, у якіх было шмат фактаў аб яго проціпраўнай дзейнасці. Паводле Лукашэнкі, Уцюрына затрымалі з доказамі злачынства, калі «*150 тысяч долараў яму чарговы раз прывезлі расіяне*»[10].

Справу Уцюрына Вярхоўны суд Беларусі пачаў разглядаць 10 сакавіка 2020 года; у працэсе некалькі разоў абвяшчаліся працяглыя перапынкі. Агулам на лаве падсудных апынулася 16 чалавек.

27 ліпеня 2020 года Вярхоўны суд прызнаў Уцюрына вінаватым у атрыманні і падбухторванні да дачы хабару і па сукупнасці злачынстваў прызначыў 12 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Акрамя таго, прысудам суда Уцюрын быў пазбаўлены звання палкоўніка і яму было забаронена на працягу пяці гадоў займаць пэўныя пасады[13].

Узнагароды

- медаль «За бездакорную службу»,

	+%D0%BA%D0%B0%D0%BC%D0%B0%D0%BD%D0%B4%D0%BD%D0%B0-%D1%96%D0%BD%D0%B6%D1%8B%D0%BD%D0%B5%D1%80%D0%BD%D0%B0%D0%B5+%D0%B2%D1%83%D1%87%D1%8B%D0%BB%D1%96%D1%88%D1%87%D0%B0&preloadparams%5B%5D=Універсальная+картка)[d]
	Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь
Камандаваў	Служба бяспекі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
Узнагароды і званні	

- ордэн «За службу Радзіме»[1].

Зноскі

1. 100 уплывовых беларусаў (http://pdf.kamunikat.org/28419-1.pdf) (недаступная спасылка). Архівавана (https://web.archive.org/web/20160305021440/http://pdf.kamunikat.org/28419-1.pdf) з першакрыніцы 5 сакавіка 2016. Праверана 9 лістапада 2015.
2. nashaniva.com (https://nashaniva.com/?c=ar&i=229728)
3. Указ Президента Республики Беларусь от 11 сентября 2014 года № 442 «О назначении А. А. Втюрина» (https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=P31400442&p1)
   Архівавана (https://web.archive.org/web/20211005173225/https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=P31400442&p1) 5 кастрычніка 2021.
4. Андрэй Уцюрын назначаны Намеснікам Дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі (https://president.gov.by/be/events/andrej-utsjuryn-naznachany-namesnikam-dzjarzhaunaga-sakratara-saveta-bjaspeki-9777)
5. Поўны спіс 208 беларускіх чыноўнікаў, якім забаронены ўезд у ЕС (https://nn.by/?c=ar&i=61552) . Наша Ніва (11 кастрычніка 2011). Архівавана (https://web.archive.org/web/20171022033809/https://nn.by/?c=ar&i=61552) з першакрыніцы 22 кастрычніка 2017.
6. COUNCIL DECISION 2012/642/CFSP of 15 October 2012 concerning restrictive measures against Belarus (https://eur-lex.europa.eu/legal-content/GA/ALL/?print=true&uri=CELEX%3A02012D0642-20150715)
7. racyja.com (https://www.racyja.com/palityka/smi-zatrymany-namesnik-dzyarzhsakrata/)
8. nashaniva.by (https://nashaniva.by/?c=ar&i=229725)
9. Указ Президента Республики Беларусь от 24 апреля 2019 года № 158 «Об А. А. Втюрине» (https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=P31900158&p1=1&p5=0)
   Архівавана (https://web.archive.org/web/20211204035003/https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=P31900158&p1=1&p5=0) 4 снежня 2021.
10. blr.belta.by (https://blr.belta.by/president/view/geta-zvychajnaja-baratsba-z-karuptsyjaj-lukashenka-prakamentsiravau-zatrymanne-utsjuryna-77957-2019/)
11. kgb.by (http://www.kgb.by/ru/news-ru/view/o-presechenii-protivopravnoj-dejatelnosti-189/)
12. nashaniva.by (https://nashaniva.by/?c=ar&i=230000)
13. Суд приговорил Втюрина к 12 годам колонии (https://www.belta.by/incident/view/sud-prigovoril-vtjurina-k-12-godam-kolonii-400145-2020/)

Спасылкі

- Андрэй Уцюрын на сайце Belarus Profile (https://web.archive.org/web/20160305010328/http://belarusprofile.com/ru/profile/utyurin-andrey-aleksandrovich)

Начальнікі Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь [схаваць]

Вячаслаў Каралёў (1994—1995) · Юрый Бародзіч (1995—1998) · *Уладзімір Кужанаў* (1998—1999) · Уладзімір Навумаў (1999—2000) · Леанід Ерын (2000) · Генадзь Нявыглас (2000—2001) · *Уладзімір Клімаў* (2001) · Яўген Двярніцкі (2001—2003) · Юрый Жадобін (2003—2007) · Андрэй Уцюрын (2007—2014) · Віктар Шынкевіч (2014—2016) · Андрэй Паўлючэнка (2016—2017) · Дзмітрый Шахраеў (з 2017)

курсівам пазначаныя выканаўцы абавязкаў

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Андрэй_Аляксандравіч_Уцюрын&oldid=4625008"